База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# ГОМЕЛЬ: ЖНІВЕНЬ 1941-ГА

Сорак пяць гадоў мінула з таго горкага дня, калі фашысцкая Германія вераломна, па-здрадніцку, без аб'яўлення вайны абрушыла ўсю моц сваей ваеннай машыны і сваіх сатэлітаў на нашу Радзіму. І ніякі час не сатрэ з памяці і перажытае. Ды і як можна забыць дым пажарышчаў і плач дзяцей і жанчын, калі мы з болем у сэрцы пакідалі нашы родныя гарады і вёскі, адыходзячы з цяжкімі баямі на ўсход.

Так, цяжкі быў час, але мы выстаялі, не здаліся на літасць ворага, перамаглі. І колькі б ні прайшло гадоў, Дзень перамогі назаўсёды застаецца ў памяці як самы шчаслівы дзень. Ен заўсёды прыносіць радасць новых сустрэч, хвалюючыя ўражанні. Вось і сёлета мне ўдалося, дзякуючы газеце «Красная Звезда», сустрэцца праз сорак пяць гадоў з адным з герояў баёў у Беларусі і пры абароне Гомеля — былым камандзірам 696-га процітанкавага артылерыйскага палка РВГК падпалкоўнікам запасу Ворanіным Андрэем Васільевічам. У той час я ў гэтым палку быў камандзірам батарэі.

Сустрэча адбылася ў падмаскоўным Дамадзедаве, дзе жыве цяпер Андрэй Васільевіч. Майму былому камандзіру ўжо 86-ты год, але выглядае ён бадзёра. Апрануў стары кіцель з двума ордэнамі Айчыннай вайны. На лацкане — знак ветэрана партыі.

Успамінаем крывапралітныя баі пад Гомелем. Мы атрымалі задачу абараняць подступы да горада, каб не дапусціць яго захопу сходу, не даць магчымасці замкнуць кальцо акружэння войск нашых 3-й і 10-й армій, якія гераічна змагаліся са шматразова пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Трэба было сарваць задуму гітлераўцаў безупынна фарсіраваць рэкі Сож і Днепр, рушыць да Смаленска, а затым і да сэрца нашай Радзімы — Масквы.

Чытаем пажоўклыя старонкі «Красной Звезды» ад 27 жніўня 1941 года, дзе ў артыкуле генерала І. Беразоўскага расказваецца пра тыя баі, у тым ліку і нашага палка:

*«Асабліва вялікіх поспехаў дабілася наша Н-ская часць. Адны толькі артылерысты гэтай часці разграмілі да двух батальёнаў нямецкай мотапяхоты, спалілі звыш 50 танкаў. знішчылі 7 батарэй фашысцкай артылерыі...»* І далей: *“14 жніўня немцы кінулі ў наступление ўсе свае сілы. Шэсць сутак запар ні ўдзень, ні ўначы не аслабявалі ўпартыя баі. Асабліва жорсткі характар насілі яны ў раёне сяленняў Сяменаўка і Пакалюбічы. Часці таварышаў Вароніна, Маневіча і Джэхуа, узмоцненыя Гомельскім народным апалчэннем, гераічна адстойвалі кожны метр савецкай зямлі. Таварыш Варонін камандаваў артылерыйскай процітанкавай часцю. У цесным узаемадзеянні з пехацінцамі таварыша Маневіча ён чацвёра сутак адбіваў адчайныя атакі цэлай нямецкай дывізіі на Сямёнаўку. Больш за 4000 фашысцкіх салдат і афіцэраў знайшлі сабе магілу ў балотах і лясах вакол Сямёнаўкі”.*

Гэтыя скупыя радкі франтавога карэспандэнта дапаўняе Андрэй Васільевіч. Захаваліся ў яго і некаторыя запісы ў сшытках. Ў адным з іх сказана, што ў баях пад Сямёнаўкай у жніўні суровага 41-га наш 696-ты процітанкавы артылерыйскі полк - разам з іншымі часцямі вёў цяжкія баі. К пяці гадзінам 12 жніўня полк разгарнуўся ля вёскі Сямёнаўка. Справа і злева — балота. Праз маленькую рачулку драўляны мост, які яшчэ ніхто не паспеў падарваць. Шлях на Гомель ворагу практычна адкрыты. Суцяшала адно — балоцістая цяжка праходная для танкаў мясцовасць. Ды яшчэ мужнасць асабовага саставу. Параіўшыся з камісарам і начальнікам штаба палка, Варонін прыняў раішэнне на гэтым рубяжы даць гітлераўцам рашучы бой. На лёгкую перамогу не разлічвалі, бо ведалі, што абласныя цэнтры малымі

сіламі не бяруцца. Праз дзве гадзіны з'явіліся танкі праціўніка. Мы падпусцілі іх на 100 метраў і абрушылі на іх ураганны агонь з нашых 36-ці зенітных гармат 85-міліметровага калібру (яны былі тады ў нас процітанкавымі). Асноўная маса танкаў была знішчана. Вораг у паніцы ўцякаў, кідаючы на полі бітвы тэхніку, забітых і параненых...

У гэтым гарачым баі я быў цяжка паранены і магу яшчэ раз сказаць сардэчнае дзякуй сваім батарэйцам — Педзяшу, Аксёнаву, Кузняцову, якія нават пад ураганным агнём не кінулі свайго камандзіра і зброю.

Далей былі цяжэйшыя баі ля Гомеля, на рацэ Сож за ўтрыманне перадмоставых плацдармаў ад насядаўшага ворага, зрывалі спробы адсячы і акружыць нашы войскі. Дарэчы, захавалася і асабістае пісьмо таварышу Вароніну ад былога члена Ваеннага савета Цэнтральнага фронта першага сакратара ЦК КП(б)Б таварыша Панамарэнкі П. К., у якім, у прыватнасці, гаварылася:

*«Паважаныя таварышы Варонін, Пічыенка!... Стаўка загадала нам утрымліваць Гомель любой цаной да таго моманту, калі 3-я армія вырвецца з акружэння, пяройдзе Днепр на пераправе ля Лоева. А Сямёнаўка стала ключавым пунктам абароны Гомеля, бо яна ляжала на напрамку галоўнага ўдару праціўніка на Гомель. З неймавернымі цяжкасцямі і гераізмам нашых сіл Гомель быў утрыманы, 3-я армія пераправілася і не засталася ў акружэнні. Пасля гэтага нашы часці па ўказанню Стаўкі пакінулі Гомель і адышлі на левы бераг ракі Сож. У сямёнаўскай эпапеі 696-ты артполк адыграў выключную ролю і назаўсёды застаўся ў маёй памяці як прыклад гераізму, бясстрашша і вернасці абавязку і прысязе».*

І зноў працягваю чытаць газету:

*«Вось мы і ў Гомелі, — піша сваёй жонцы ў Мюнхен фельдфебель Штар, захоплены заўчора разам з пісьмом у палон. — Я кажу мы, таму што я так прывык табе пісаць, маючы на ўвазе пад "мы" нашу роту. 10 дзён назад нас было 138 чалавек у роце. Зараз нас засталося 18. Сёння мы увесь дзень хадзілі па Гомелі ў надзеі знайсці што-небудзь для падарунка табе і для задавальнення ўласнага голаду. Ды дзе там! У горадзе нічога няма. Нават сады і тыя без яблык...»*

*«Сады без яблык, магазіны без тавараў, фабрыкі без машын і сыравіны, склады без адзінага зярнятка, дамы без жыхароў, — вось што заспелі фашысты ў Гомелі. Больш як 80 тысяч забітых і параненых, каля 200 танкаў, некалькі соцень гармат і тысячы аўтамашын, каля ста самалётаў — так заплаціла фашысцкае камандаванне за Гомель».*

Гэты кароткі экскурс у суровы 41-шы я хачу закончыць словамі: мы, франтавікі, якія прайшлі скрозь агонь першых дзён і месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, заўсёды памятаем вас, дарагія гамяльчане, і вашых землякоў, якія нам дапамагалі ў агульнай барацьбе з заклятым ворагам.

**Р. БІРУКОЎ, былы камандзір батарэі 696-га процітанкавага артылерыйскага палка, генерал-маёр запасу, доктар ваенных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі РСФСР.**